УДК 069.51+908

# ПОЛАЦКІЯ ВЫДАННІ ПАЧАТКУ XX ст. У ЭКСПАЗІЦЫІ МУЗЕЯ БЕЛАРУСКАГА КНІГАДРУКАВАННЯ

**Лутава Д. А.**
Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік
(г. Полацк, Беларусь)

Анатацыя. прадстаўлены агляд друкаванай прадукцыі, якая была выдадзена ў Полацку ў пачатку XX ст. і сёння размешчана ў экспазіцыі Музея беларускага кнігадрукавання. Апісаны паходжанне, знешні выгляд і змест васьмі прадметаў з трох музейных калекцый: друкаваных выданняў (кніга, брашуры, буклет), фотадакументаў (фотаальбом) і філакартыі (тры паштоўкі).

Ключавыя словы: экспазіцыя, музейны экспанат, выдавецкая справа, выданні.

Summary. the article gives the review of the printed products published in Polotsk at the beginning of the 20th century, which are displayed at the exposition of the Museum of Belarusian book printing. It analyzes the origin, appearance and content of eight objects from three museum collections: the book, two brochures, the booklet, the photo album and three photos.

Keywords: exposition, exhibit, publishing, edition.

Пачатак XX ст. адметны значным уздымам выдавецкай справы на тэрыторыі Беларусі. За гэты час на Беларусі выйшла 4 355 выданняў – гэта ў два разы больш, чым у 2-й палове XIX ст. [1, с. 4]. Актыўна дзейнічалі не толькі губернскія друкарні, але і шматлікія прыватныя.

У Полацку на пачатак XX ст. існавала тры прыватныя друкарні: друкарня Х. Клячко (Віцебская вул., дом Баркана), Н. Сраліовіча (Віцебская вул., дом Шнейваса) і Б. Фейгінова (Спаская вул., дом Эпштэйна) [3, с. 261; 6, с. 248; 7, с. 14].

Старэйшай з пералічаных з'яўлялася друкарня віленскага мешчаніна Хаіма Вульфава Клячко, адкрытая адразу пасля пераезду выдаўца ў Полацк у 1874 г. Праз два гады ўласную друкарню заснаваў полацкі мешчанін Берка Янкелеў Фейгінаў, прадпрыемства якога было абсталявана літаграфіяй. У 1897 г. свае дзверы адчыніла трэцяя полацкая друкарня, уладальнікам якой стаў таленавіты наборшчык і вучань Х. Клячко – Нахум Абрамаў Сраліовіч, які пераехаў у Полацк з Ковенскай губерні.

Аб добрым стане спраў у полацкіх друкарнях сведчыла імкненне Х. Клячко і Н. Сраліовіча да тэрытарыяльнага пашырэння сваёй дзейнасці на г. Дрысу. Аднак мара прадпрымальнікаў у поўнай ступені не здзейснілася. Планам, хутчэй за ўсё, перашкодзіла спроба ў 1902 г. двух полацкіх мяшчан – Д.Ш. Піруцінскага і З.Г. Нэйгаўзена – адкрыць чацвёртую друкарню. Уласнікі першых трох прадпрыемстваў былі вымушаны адкупіцца ад канкурэнтаў (з умовай, што апошнія спыняць хадайніцтва па адкрыцці новых друкарняў) [2, с. 18].

На пачатку XX ст. Полацк быў невялікім правінцыйным горадам еўрапейскай часткі Расійскай імперыі, у якім не было вялікіх грамадска-асветніцкіх аб'яднанняў, з-за чаго выдавецкай дзейнасці трох мясцовых друкарняў было дастаткова. Асноўным відам полацкай друкаванай прадукцыі ў гэты час былі брашуры апісальнага характару аб'ёмам да 40 старонак («Путеводитель по городу Полоцку» (1910), «Прощание его Преосвященство Преосвященнейшего Инокентия, бывшего епископа Полоцкого и Витебского с духовентвом паствою и учреждениями Полоцкой епархии» (1915), «Отчетъ Полоцкой библіотеки за 1915 год» (1916) і інш.). Выданні былі разлічаны на густ павятовага абывацеля (І.Д. Арлоўскі «Бѣлорусскіе народные разсказы» (1908), М.Н. Дурасовіч «Самоучитель кройки и шитья дамской, детской и мужской обуви, составленной по легко понимаемому методу» (1908) і інш.).

У якасці выдаўцоў часам выступалі і ўладальнікі кнігарняў, магазінаў пісьмовых тавараў і бібліятэк для чытання. У пачатку XX ст. у Полацку сярод іх былі наступныя: М.Е. Екатава (Віцебская вул.), Ш. Гофеншэфер (Віцебская вул.), М. Ліўшыц (Віцебская вул.), В. Трафімаў (Гандлёвая плошча), аддзяленне віцебскай лаўкі Св. Уладзімірскага Брацтва (Базарная плошча паблізу Аднаверскай царквы), Яхнін (Надзвінская вул., дом Смушкіна) [7, с. 14].

У экспазіцыі Музея беларускага кнігадрукавання прадстаўлены восем экспанатаў, якія адносяцца да полацкіх выданняў пачатку XX ст. З іх чатыры адносяцца да калекцыі друкаваных выданняў: кніга І.Д. Арлоўскага «Бѣлорусскіе народные разсказы», брашуры «Путеводитель по городу Полоцку» і «Отчетъ Полоцкой библіотеки за 1915 год», а таксама мініяцюрны буклет з відамі Полацка. Адзін прадмет адносіцца да калекцыі фотадакументаў – гэта фотаальбом пераносу мошчаў св. Еўфрасінні Полацкай. Тры паштоўкі з відамі горада Полацка адносяцца да калекцыі філакартыі.

ДРУКАВАНЫЯ ВЫДАННІ

1. Першы том кнігі ***«Бѣлорусскіе народные разсказы»*** (КП4-2147) пад аўтарствам Іосіфа Данілавіча Арлоўскага выйшаў з полацкай друкарні Н.А. Сраліовіча ў 1908 г. Гэта адзіная вядомая кніга, выдадзеная на Полаччыне ў XIX – пачатку XX ст., на беларускай мове [4, с. 247, 589].

Іосіф Арлоўскі – пісьменнік канца XIX – пачатку XX ст., звестак пра якога амаль няма. Магчыма, быў селянінам з Віцебшчыны. «Бѣлорусскіе народные разсказы» сталі яго адзіным вядомым творам. У савецкія часы І. Арлоўскі быў раскрытыкаваны за «псеўданародны» стыль, у той час як яго сучаснікі (пісьменнікі і этнографы: М. Гарэцкі, Я. Карскі і інш.) даволі станоўча адносіліся да яго дзейнасці. Вацлаў Ластоўскі, напрыклад, размясціў гэтую кнігу на паліцах уласнай бібліятэкі [8, с. 135].

Кніга мае пераплёт з кардону, старонкі якога абклеены паперай шэрага колеру; карашок абцягнуты тканінай карычневага колеру. У выданні выкарыстоўваюцца шрыфты розных памераў, прабелы паміж сімваламі значна адрозніваюцца, што можа сведчыць аб невысокай якасці друкарскага абсталявання. Выданне складаецца з 94 старонак. Памер кнігі – 20,7х13,7х0,6(26,0) см. Захаванасць прадмета здавальняючая: прысутнічаюць плямы, падцёкі, пацёртасці вокладкі, пажоўкласць паперы, загіны вуглоў, забруджванне. На тытуле ўверсе штамп: «Беларуская Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка // Інстытут Беларускае культуры // Бібліятэка»; там жа ўнізе – «ІНВ. ПРАВЕРКА 1948 г.»; «Урадавая Бібліятэка БССР // імя // А. М. Горкага» (такія ж на с. 17) і надпіс чарнілам: «Биб. СНК». На с. 2 пасярэдзіне штамп: «Инв. 1954 г.».

Змест кнігі наступны:

1) «Предисловіе» ў вершаванай форме (змешчана на с. 3–4), асноўным матывам якога з'яўляецца заклік да людзей, каб тыя маліліся Богу:

«Ня треба намъ за богатствомъ гайсать
Для житья одной минуты
Ти ня лучше намъ души свои спосать
Кабъ избавитца вѣчной покуты» [5, с. 4].

2) Асноўны змест (с. 5–94) прадстаўлены ў выглядзе вершаваных і празаічных апаведаў, якія змяшчаюць багаты фальклорны матэрыял і адлюстроўваюць уяўленні беларускага сялянства аб навакольным свеце. Міфапаэтычная карціна свету беларусаў праглядаецца амаль на кожнай старонцы: часам у тэксце ўзнікае постаць чараўніка ці ведзьмы, русалак ці чарцей. Аўтар змясціў у выданні апаведы пра традыцыйныя абрады, так, напрыклад, апісваецца беларускае вяселле). У тэксце паўстаюць вобразы пана і вясковага мужыка, размова заходзіць і пра хітрых купцоў, ксяндзоў і папоў. Закранаецца і вечнае пытанне адносінаў паміж бацькамі і дзецьмі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

На вокладцы кнігі пазначаны кошт выдання – 25 кап.

2. Брашура ***«Отчетъ общества полоцкой библіотеки за 1915 годъ»*** (КП4-2148) выйшла з полацкай друкарні Х.В. Клячко ў 1916 г.

Брашура ў вокладцы з паперы шэрага колеру, складаецца з 28 старонак (з улікам вокладкі). Памер – 22,1х18,0(31,4) см. Захаванасць здавальняючая: плямы, падцёкі, пажоўкласць паперы, выцвітанне вокладкі, загіны вуглоў, надрывы вокладкі, вертыкальны згін, па карашку брашура падклеена складзеным удвая кавалкам кардону (22,х3,7см). На с. 3 – бібліятэчныя штампы праверкі, якія датуюцца 1936, 1938, 1940, 1946, 1951 гг.

Змест брашуры наступны:

1) «Общій обзоръ дѣятельности библіотеки», с. 3–5;

2) «Движеніе книжнаго имущества», с. 6–7;

3) «Спискоъ періодическихъ изданій полученныхъ в 1915 г. за плату», с. 8;

4) «Список годовых членов», с. 8–10;

5) «Отчетъ Полоцкой Общественной Библіотеки за 1915 годъ: Балансъ, Оборотъ, Смѣта», с. 11–16;

6) «Протоколъ Общаго Собранія 28 февраля 1916 г.», с. 17;

7) Таблица № 1 (якая паказвае павелічэнне колькасці кніг і аперацыі па іх выдачы з 1912 па 1916 г.), с. 20–21;

8) Таблица № 2: Свѣдѣнія о выданныхъ книгахъ по отдѣламъ (за 1915 г.), с. 24–25.

3. Брашура ***«Путеводитель по городу Полоцку»*** (КП6-2826), надрукаваная ў друкарні Х.В. Клячко ў 1910 г. Выдавец – Полацкае Царкоўнае Брацтва.

Гэта брашура ў вокладцы з паперы шэрага колеру. Складаецца з 24 старонак і 1 ліста з планам г. Полацка. Памер – 17,8х11,4(34,0х42,0) см. Памер плана – 41,6х34см. Захаванасць здавальняючая: надрывы, адарванасць вокладкі ад блока, карашок падклееныя тканінай белага колеру, пажоўкласць, выцвітанне, пацёртасць, загіны вуглоў, забруджванне. На 4-й с. вокладкі – штамп Полацкага краязнаўчага музея.

Змест брашуры наступны:

1) Оглавленіе (2-я с. вокл.);

2) Краткій очеркъ г. Полоцка (с. 1–4);

3) Монастыри, храмы и молитвенные дома (с. 5–8);

4) Гостиницы, меблированные комнаты и заезжіе дома (с. 8–9);

5) Столовыя и чайныя (с. 9–10);

6) Булочныя и пекарни (с. 5);

7) Учебныя заведенія (с. 10–13);

8) Книжные магазины и библиотеки для чтенія (с. 14);

9) Типографіи (с. 14);

10) Правительственныя учрежденія (с. 14–16);

11) Общественныя и сословныя учрежденія (с. 16–17);

12) Нотаріальныя конторы (с. 17);

13) Благотворительныя учрежденія (с. 7–18);

14) Фотографіи (с. 18);

15) Врачебная помощь (с. 18–19);

16) Торговля (с. 20);

17) Бани (с. 20–21);

18) Пути сообщенія (с. 21–23);

19) Такса, установленная Полоцкою Городскою Думою на время съ 15 мая по 1 іюня 1910 г. на продажу въ г. Полоцке продуктовъ первой жизненной потребности (с. 23–24);

20) Такса для легковыхъ извозчиковъ г. Полоцка и цены на №№ въ гостиницахъ (4-я с. вокл.).

Пазначаны кошт брашуры – «Цѣна 20 к. въ пользу дѣтскаго сиротскаго пріюта въ г. Полоцкѣ». За 20 коп. у гэты час у Полацку можна было дзясятак яек ці адзін фунт свіной вяндліны [7, с. 24].

4. ***Буклет мініяцюрны з відамі г. Полацка*** (КП2-1422/1). Надрукаваны ў Полацку ў 1910 г. Аўтар – фотамастак Бермант.

Буклет мае форму гармоніка, які складваецца ў суцэльны стылізаваны партфель. У ім змешчаны дзесяць фотаздымкаў з краявідамі Полацка. Матэрыял – фотапапера. Памер 2,5(у раскладзеным выглядзе – 26,8)х3,5 см. Захаванасць здавальняючая: дробныя заломы паперы, надрывы, забруджванне.

Змест выдання наступны: буклет складаецца з дзесяці фотаздымкаў розных частак горада Полацка пачатку ХХ ст.:

1) Чыгуначная станцыя;

2) Чырвоны мост;

3) Настаўніцкая семінарыя;

4) Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр;

5) Кадэцкі корпус (уваход);

6) Кадэцкі корпус (панарама);

7) Помнік вайне 1812 г.;

8) Мікалаеўскі вакзал;

9) Жаночая гімназія;

10) Мост праз Зах. Дзвіну.

ФОТАДАКУМЕНТЫ

1. ***Фотаальбом з фотаздымкамі, якія адлюстроўваюць святкаванні, звязаныя з пераносам мошчаў святой Еўфрасінні Полацкай з Кіева ў Полацк у 1910 г.*** (КП6-3006).

Экспанат уяўляе сабой альбом у вокладцы цёмна-вішнёвага колеру, з тонкай залатой рамкай на верхняй покрыўцы. Ён мае 19 лістоў шэрага колеру, на якіх размешчаны 41 фотаздымак. Лісты пранумараваны ад рукі ў верхнім правым вугле. На першым лісце фотаздымак з выявай абраза Еўфрасінні Полацкай, выразаны разам з кардонам. У альбом укладзены адзін фотаздымак на паспарту цёмна-зялёнага колеру, з выявай натоўпу людзей каля Спаса-Праабражэнскай царквы. Форзацы альбома аліўкавага колеру з выявай лісця. На пярэднім форзацы, у верхнім левым вуглу – наклейка круглай формы з выявай арла на кнізе (кніга адлюстравана з тарца) і датай «1871».

У альбоме змешчаны фотаздымкі, выкананыя не толькі ў 1910 г., але і ў 1904 г., калі праводзілася замена звана на Мікалаеўскім саборы, які быў пашкоджанны ў ходзе Айчыннай вайны 1812 г. Вядомыя аўтары некаторых фотаздымкаў. Так, аўтарам фотаздымка, які змешчаны на другой старонцы пятага ліста, з'яўляецца полацкі павятовы фатограф Мікалай Тарасавіч Міронаў. Аўтар фотаздымка, змешчанага на другой старонцы шаснаццатага ліста, – Юдэль Рубінавіч Бермант. Фотадрук чорна-белы.

Можна меркаваць, што альбомы, якія адлюстроўваюць святкаванні, звязаныя з пераносам мошчаў святой Еўфрасінні Полацкай, выходзілі як з фотаздымкамі аднаго мастака, так і з фотаздымкамі розных фатографаў.

Памер – 23,5х34,5х3,5 см. Захаванасць здавальняючая: дэфармацыя, пажаўценне, на першым лісце фотаздымак выразаны, 19-ты ліст страчаны, 20-ты ліст адарваны, моцная пацёртасць, плямы, надпісы, заломы, забруджванне.

ФІЛАКАРТЫЯ

1. Паштоўка ***«Полоцкъ. Софійскій Соборъ»*** (КП5-2321/8). Выдавец Ш. Гофеншэфер (уладальнік кніжнай крамы).

Паштоўка з тонкага кардону змяшчае на правым баку выяву будынка Сафійскага Сабора і замка езуітаў з боку Зах. Дзвіны; уверсе, у адзін радок тыпаграфскім шрыфтам змешчаны надпіс: «Полоцкъ. Софійскій Соборъ». На адваротным баку – паштовыя адзнакі; злева, унізе ў адзін радок надпіс: «Изд. Кн. Маг. Ш Гофеншефера въ Полоцке». Адваротны бок паштоўкі прызначаны для адраса і адкрытага пісьма. Памер – 8,8х14,0 см. Захаванасць здавальняючая: агульнае забруджванне, пажоўкласць, на адвароце плямы ад клею, загіны вуглоў, пацёртасць.

2. Паштоўка ***«Полоцкъ. Памятникъ 1812 году»*** (КП5-2321/7). Выдавец М.М. Ліўшыц (уладальнік магазіна пісьмовых тавараў).

На правым баку паштоўкі змешчана выява помніка 1812 года ў Полацку і людзей каля яго на фоне двухпавярховага будынка. Унізе надпіс, зроблены ў адзін радок шрыфтам чырвонага колеру: «Полоцкъ. Памятникъ 1812 году». У ніжнім левым вугле змешчаны таксама надпіс, які зроблены ў адзін радок мастацкім шрыфтам чырвонага колеру: «Писчебум. Магаз. М.М. Лившица». На адвароце – паштовыя адзнакі. Памер – 13,8х8,8 см. Захаванасць здавальняючая: агульнае забруджванне, пажоўкласць, плямы, пацёртасць, загіны вуглоў.

3. Паштоўка ***«Полоцкъ. Николаевскій соборъ»*** (КП16-16459). Выдавец

А.А. Рафайловіч (уладальнік магазіна пісьмовых тавараў).

Паштоўка з выявай Мікалаеўскага сабора і помніка 1812 года з боку Верхне-Пакроўскай вуліцы. Уверсе паштоўкі, бліжэй да левага вугла, змешчаны надпіс: «ПОЛОЦКЪ. Николаевскій соборъ», які зроблены тыпаграфскім шрыфтам чырвонага колеру ў адзін радок. На адвароце – паштовыя адзнакі. Імя выдаўца змешчана ўздоўж левага вертыкальнага зрэзу ў адзін радок шрыфтам зялёнага колеру. Адваротны бок паштоўкі прызначаны для адраса і адкрытага пісьма. Памер – 13,9х8,7 см. Захаванасць здавальняючая: агульнае забруджванне, пажоўкласць, плямы, загіны вуглоў.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Такім чынам, у экспазіцыі полацкага Музея беларускага кнігадрукавання полацкія выданні пачатку XX ст. прадстаўлены ў колькасці васьмі прадметаў, якія адносяцца да розных тыпаў друкаванай прадукцыі. Яны розныя па прызначэнні, змесце і паліграфічнай якасці, а іх выдаўцамі выступалі самыя розныя асобы і арганізацыі. Аб'ядноўвае іх тое, што ўсе яны былі створаны ў полацкіх друкарнях пачатку XX ст.

Апісаныя музейныя прадметы дэманструюць ланшадфт і забудову горада стагадовай даўнасці, з'яўляюцца каштоўнымі крыніцамі па яго сацыяльна-эканамічным развіцці. Не абмінулі тагачасныя полацкія выдаўцы адну значную культурную падзею краю – святкаванне, звязанае з пераносам мошчаў святой Еўфрасінні Полацкай з Кіева ў Полацк у 1910 г. Экспазіцыя Музея беларускага кнігадрукавання прадстаўляе нават адзінае беларускамоўнае выданне, надрукаванае ў Полацку ў пачатку XX ст. Такім чынам, полацкія выданні пачатку XX ст. з экспазіцыі музея з'яўляюцца цікавым летапісам мінулага, каштоўным матэрыялам для вывучэння гісторыі краю.

**Літаратура:**


1. Ашуева, В. Я. Беларускія выданні на рускай мове к. XIX – пач. XX стст. у фондах НПГКМЗ / В. Я. Ашуева // Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі: (па выніках навукова-даследчай работы ў 2001 г.) / уклад. Т. А. Джумантаева. – Полацк: НПГКМЗ, 2002. – С. 3–6.
2. Вазьміцель, А. В. Друкарская справа ў Полацку ў другой палове XIX – XX стст. / А. В. Вазьміцель // Матэрыялы навуковай гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі: да 75-годдзя Полацкага краязнаўчага музея, Полацк, 18–19 мая 2001 г. /; уклад. В. Д. Краско. – Полацк: НПГКМЗ, 2001. – С. 17–21.
3. Дэйніс, І.П. Полацкая даўніна / І. П. Дэйніс; уклад., прадм. і камент. М. Баўтовіча; пер. з рускай мовы М. Ермалаева. – Мінск: Медисонт, 2007. – 330 с.
4. Кніга Беларусі. 1517–1917: зводны каталог / рэд. Г.Я. Галенчанка. – Мінск: БелСЭ, 1986. – 616 с.
5. Орловский, І. Д. Бѣлорусскіе народные разсказы. Сочиненія Іосифа Даниловича Орловскаго. Томъ І. – Полоцкъ: Типографія Н. А. Сроліовича, 1908. – 94 с.
6. Памяць: гіст.-дакум. хроніка Полацка / рэд. кал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск: БелЭн, 2002. – 912 с.
7. Путеводитель по городу Полоцку. – Полоцк: Полоцкое Церковное Братство, тип-я Х. В. Клячко, 1910. – 24 с.
8. Сільнова, І. Д. Экслібрыс Вацлава Ластоўскага / І. Д. Сільнова // Першыя кнігазнаўчыя чытанні: матэрыялы міжнароднай канферэнцыі, Мінск, 15 верасня 1998 г. / Нац. б-ка Беларусі; склад. Т. І. Рошчына. – Мінск, 2000. – С. 129–135.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова